**І.Г.Лупашка,**
*аспірантка*

# СПЕЦЫФІКА АДЛЮСТРАВАННЯ РЭЧАІСНАСЦІ Ў МУЗЕЯХ ЛІТАРАТУРНАГА ПРОФІЛЮ

Музейная экспазіцыя ў сучасным разуменні гэтага слова не проста сукупнасць музейных прадметаў, якія выстаўляюцца для агляду. Музейныя экспазіцыі маюць шэраг адрозненняў ад немузейных (камерцыйных выстаў, вітрын магазінаў і інш.). Па-першае, у іх аснове музейны прадмет, носьбіт пэўнай гісторыка-культурнай інфармацыі. Па-другуе, спалучэнне музейных прадметаў арганізуецца ў прасторы з дапамогай загадзя створанага навуковага праекта. Па-трэцяе, музейная экспазіцыя з'яўляецца сінтэзам навукі і мастацтва і ажыццяўляецца з дапамогай архітэктурна-мастацкіх сродкаў. Музейны прадмет, які трапіў у экспазіцыю, уступае ва ўзаемадзеянне з іншымі музейнымі прадметамі і становіцца экспанатам. Сукупнасць экспанатаў, аб'яднаных адной навуковай праблемай і адпаведна гэтаму размешчаных у часе і прасторы, утварае экспазіцыйны комплекс або раздзел экспазіцыі [2, с. 7].

Пачатак любой экспазіцыі — стварэнне яе навуковага праекта, які складаецца з трох этапаў:

1. Распрацоўка навуковай канцэпцыі.
2. Стварэнне разгорнутай тэматычнай структуры.
3. Стварэнне тэматыка-экспазіцыйнага плана.

Вынікам кожнага з гэтых этапаў з'яўляецца адпаведны пакет дакументаў, неабходных лдя далейшай працы над экспазіцыяй.

Працэс праектавання музейнай экспазіцыі даволі складаны і шматгранны. Ён носіць сістэмны характар і не завяршаецца толькі навуковым праектам. Сучасная экспазіцыя — гэта сінтэз навукі і мастацтва. Таму абявязкова на этапе праекта неабходна распрацаваць архітэктурна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкія асновы экспазіцыі, а таксама прааналізаваць магчымасці ўспрымання яе будучым наведвальнікам.

Відавочна, што музеі розных профіляў пры значнай колькасці агульных рыс маюць адметнасці ў методыцы пабудовы экспазіцый. Не выключэнне і літаратурныя экспазіцыі.

Прадметам літаратурнай экспазіцыі з'яўляюцца:

1) гісторыка-літаратурны працэс;

2) жыццё і творчасць пісьменніка;

3) мастацкі твор.

У нейкай ступені літаратурную экспазіцыю можна ўспрымаць як своеасаблівы від папулярызацыі літаратуры. Безумоўна, цікавасць да літаратуры можна задаволіць кнігамі, крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі, але па моцы эмацыянальнага ўздзеяння з экспазіцыяй не могуць быць параўнаны ні даследаванне, ні крытычны артыкул на тую ж тэму. У адрозненне ад навуковага даследавання, крытычнага артыкула экспазіцыя выкарыстоўвае не "отвлеченные понятия", а наглядныя матэрыялы.

Падтрымліваючы думку Л.Меднэ, лічым, што працу работніка, які стварае літаратурную экспазіцыю, у некаторай ступені можна параўнаць з працай літаратуразнаўцы. Менавіта на першым этапе работы экспазіцыянер выступае як літаратуразнаўца-даследчык. Але ў адрозненне ад літаратуразнаўцы ён працягвае працу і пасля даследавання літаратурнага факта [1, с. 20]. Літаратуразнаўца для стварэння сваёй працы выкарыстоўвае толькі слова. Экспазіцыянер жа выкарыстоўвае экспанаты. Тэкст таксама прыходзіць яму на дапамогу, але ў абмежаванай колькасці.

У літаратурнай экспазіцыі можна адлюстраваць гістарычную эпоху; біяграфію пісьменніка; яго грамадскую дзейнасць; рэчаіснасць, якая паслужыла матэрыялам для творчасці пісьменніка; змест і ідэйны сэнс твора; некаторыя пытанні творчай лабараторыі пісьменніка (праца над рукапісам і інш.); значнасць творчасці пісьменніка для сучаснікаў і наступных пакаленняў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя пытанні методыкі пабудовы літаратурных экспазіцый ставіліся яшчэ ў 30-я гады XX стагоддзя. Яны ўзнікалі і вырашаліся пры стварэнні выстаў у Дзяржаўным літаратурным музеі СССР (у Беларусі працэс узнікнення літаратурных музеяў адбываўся ў асноўным пасля Вялікай Айчыннай вайны). Гэтыя пытанні, а менавіта характар экспазіцыйнага матэрыялу ў літаратурным музеі, функцыі тэксту ў літаратурнай экспазіцыі, прыцыпы пабудовы экспазіцыйнага комплексу, мнагапланавасць экспазіцыі, застаюцца актуальнымі і сёння.

Да 30-х гадоў лічылася, што паўнавартаснымі экспанатамі з'яўляюцца толькі выяўленчыя матэрыялы. Нават да 50-х гадоў экспазіцыі літаратурных музеяў у асноўным будаваліся па прыцыпу ілюстрацыйнасці. Гэта значыць, што асноўны змест твораў паказваўся праз мноства ілюстрацый, часам маламастацкіх, з дапамогай тэкстаў і цытат. Выставы 30-х гадоў у ДЛІМ СССР паказалі, што асноўным, "вядучым" экспанатам з'яўляецца той, які дазваляе лепш раскрыць дадзеную тэму. У адным выпадку — гэта партрэт, у другім — ілюстрацыя, кніга, афіша і іншае, і ўсе матэрыялы могуць уваходзіць у лік асноўных, а не "падсобных" музейных прадметаў. Яшчэ ў 1937—1938 гг. гэта палажэнне выклікала спрэчкі. Напрыклад, у 1937 г. на выставе, прысвечанай У.Маякоўскаму, у якасці аднаго з вядучых экспанатаў была афіша выступлення паэта. Праз некаторы час часопіс "Советский музей" надрукаваў такую рэцэнзію: "... не всякий подлинник может быть с одинаковым успехом использован для экспозиции... Афиши... следовало дать, но в экспозиции второго плана". Ужо ў 30-я гг. XX ст. кніга, а затым рукапіс, дакумент пачалі выкарыстоўвацца на выставах, у тым ліку і як "вядучы" элемент.

Зыходзячы з практычнага вопыту, можна вылучыць асноўныя групы экспазіцыйных матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца ў літаратурных музеях найбольш часта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэта мемарыяльныя, асабістыя, арыгінальныя прадметы; рукапісы; кнігі і часопісы; выяўленчыя матэрыялы; фотаматэрыялы; дакументы; друкаваны тэкст; кіна- і фонаматэрыялы.

З развіццём музеязнаўства мянялася і разуменне таго, што павінна ўяўляць сабой літаратурная экспазіцыя. Сёння літаратурныя і мемарыяльныя экспазіцыі ўтрымліваюць элементы этнаграфічнага, мастацкага, краязнаўчага і гістарычнага характару. Менавіта з выкарыстаннем нелітаратурных элементаў будуецца экспазіцыйная работа любога літаратурнага музея. Больш таго, літаратурныя музеі выкарыстоўваюць бытавыя, этнаграфічныя, мастацкія музейныя прадметы ў галоўнай ролі экспазіцыйнай тэмы. Прыкладам можа служыць экспазіцыя "Вяртанне пана Тадэвуша" ў Завоссі (філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры). Функцыянаванне такіх экспазіцый у музеях літаратурнага профілю цалкам апраўдана. Мэтазгоднасць іх існавання можна аргументаваць перш за ўсё тым, што яны дазваляюць наглядна пераканаць наведвальніка ў існаванні рэальнага матэрыялу, які калісьці быў адной з асноўных крыніц для творчасці пісьменніка. Тым больш, што асаблівую цікавасць у наведвальнікаў выклікаюць менавіта тыя экспанаты, якія характарызуюць сувязь дакладных фактаў і з'яў рэчаіснасці з літаратурным творам (прататыпы, канкрэтнае месца, якое апісана ў творы, і інш.).

Аднак музейныя прадметы ў літаратурным музеі ў сваёй большасці з'яўляюцца плоскаснымі, што стварае дадатковыя складанасці ў іх прэзентацыі. Трэба арганізаваць экспазіцыйную прастору так, каб не губляліся "галоўныя экспанаты", экспанаты-сімвалы. Тут на дапамогу экспазіцыянеру прыходзіць мастак. Пры стварэнні навуковай канцэпцыі экспазіцыі мастак працуе ў цеснай узаемасувязі з навуковымі супрацоўнікамі. На аснове навуковага праекта ён распрацоўвае сістэму вобразаў будучай экспазіцыі, яе форму, стылістыку.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Экспазіцыйныя комплексы ў літаратурным музеі (як і іншых) могуць быць пабудаваны як на аднародных, так і на разнародных матэрыялах. Але ёсць адно выключэнне: у музейнай экспазіцыі не можа быць комплексу, пабудаванага цалкам на тэкстах. Тэкст можа выступаць у якасці экспаната, але не павінен адыгрываць галоўную ролю ў экспазіцыйным комплексе.

У апошнія дзесяцігоддзі ў літаратурных музеях адбыўся паварот ад манаграфічнага паказу жыцця і творчасці пісьменнікаў да больш шырокага адлюстравання ўсяго гісторыка-літаратурнага працэсу. Робіцца акцэнт на выяўленні сувязей літаратуры з эпохай, шырэй адлюстроўваецца тая рэчаіснасць, якая аказала ўплыў на станаўленне пісьменніка. Гэта не выпадкова, таму што перад літаратурнымі музеямі стаіць важная задача — зафіксаваць гісторыю функцыянавання літаратуры ў розныя гістарычныя эпохі.

---

1. *Медне Л.* Основные принципы литературных экспозиций // Методика литературных экспозиций: Сб. ст. — М., 1957. — Вып. 1. — С. 5—23.

2. *Сташкевіч А.Б.* Стварэнне музейных экспазіцый. Этап навуковага праектавання // Навуковае праектаванне музейных экспазіцый: Навук.-метад. зб. — Мн., 1996. — С. 6— 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.Е.Лявончыкаў,**
*прафесар*

## АДЛЮСТРАВАННЕ РЭЛІГІЙНА-ЦАРКОЎНАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў КРЫНІЦАХ БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯГРАФІІ (XV – пачатак XX ст.)

Бібліяграфічнымі помнікамі, з якіх пачалася гісторыя беларускай бібліяграфіі, з'явіліся вопісы фондаў бібліятэк,